

# Да гісторыі выдавецкага дома «Беларуская навука»



Георгій Кісялёў

*У пачатку гэтага года Выдавецкі дом «Беларуская навука» ўрачыста адзначыў сваё 100-годдзе. Але ж у 11-м томе Беларускай энцыклапедыі (2000) у артыкуле пра выдавецтва «Навука і тэхніка» значыцца, што яно працавала ў 1924–1996. Якім жа чынам выдавецкі дом, папярэднікам якога былі выдавецтвы «Навука і тэхніка», а пазней – «Беларуская навука» (1996–2005), «памаладзеў» на 2 гады?*

Падставай для вызначэння часу заснавання выдавецтва (1924 г.), пэўна, паслужыла архіўная даведка загадчыка рэдакцыі літаратуры па гісторыі і праву выдавецтва «Навука і тэхніка» А.І. Валахановіча, у якой гаварылася: «По документальным источникам в штатном расписании Института белорусской культуры на 1924–1925 бюджетный год значится издательская часть, в 1925–1927 гг. – издательский отдел, в 1927–1928 г. – издательское бюро. В штатах Белорусской академии наук в 1929–1931 гг. значилось издательское бюро, в 1932 г. – издательство Академии наук». Валахановіч тут дае спасылку на даведку Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі за №396 ад 06.12.1971 г.

Разам з тым даследчык гісторыі акадэмічнай навукі М.У. Токараў і вядомы архівіст і гісторык В.У. Скалабан выказалі сумненні адносна таго, што 1924 г. з'яўляецца годам заснавання выдавецтва. Па нашай просьбе Віталь Скалабан папрацаваў у архіве і перадаў шэраг дакументаў, з якіх сапраўды вынікалі іншыя даты. Так, у пратаколе пасяджэння Прэзідыума Інбелкульта ад 29 верасня 1925 г. гаварылася (стыль і арфаграфія дакументаў тут і далей захаваны): «Прымаючы пад увагу, што цяперашняя Рэдакцыйная Колегія ІБК у умовах працы, шматлікасьці свайго складу за перазагружанасьцю паасобных сяброў службовай працай ня можа справіцца з працай наступнага году, лічыць патрэбным рэарганізаваць выдавецкі аппарат наступным спосабам: замест рэдакцыйнай калегіі, якая існуе да гэтага часу, зарганізаваць рэдакцыйную колегію з 5 чалавек на чале з старшынёй яе – адказным рэдактарам, якога ўвесьці ў склад прэзідыуму для цясьнейшай сувязі з апошнім… Іншыя чатыры члены колегіі пажадана падабраць так, каб адзін з іх зьяўляўся грамадзянаведам, другі прыродазнаўцам, трэці гісторыкам і чацьверты – мовазнаўцам, каб такім чынам кожная праца прыгатаваная да друку і зацьверджаная для гэтай мэты секцыяй альбо камісіяй праглядалася прынамсі 3 асобамі – старшынёй (адказным рэдактарам), адказным за ідэалёгію выданьня членам рэдакцыйнай колегіі і мовазнаўцам…» [1]. У пратаколе пасяджэння прэзідыума Інбелкульта №39 ад 24 лістапада 1925 г. ёсць канкрэтны пункт – «Аб персанальным складзе выдавецкага аддзелу ІБК», дзе пастанаўлялася «зацьвердзіць т. Смоліча адказным рэдактарам, ідэолёгічным рэдактарам т. Акуліка, рэдактарам мовы т. Лёсіка, рэдактарам-гісторыкам – проф. Доўнар-Запольскага, рэдактарам-прыродазнаўцам т. Трэмповіча» [1].

У раскладзе штатных пасадаў ІБК на 1925–1926 аператыўны год у раздзеле «Дапаможныя ўстановы ІБК» пад літарай а згадваецца рэдакцыйна-выдавецкі аддзел у наступным складзе: «сакратар рэдакц. калегіі – Красінскі М., тэхнічны рэдактар (стылісты) – Ламака К. (закрэслена, зверху напісана: «Дудар» – Г.К.), адказны навук. карэктар – Панамарова Н.» [2].

Захавалася таксама ў архіве «Ведомость на выплату зарплаты сотрудникам Института Белорусской Культуры за август м-ц 1926 г.», у якой значацца «Секретарь Редакц. Коллегии Красинский М., ответ. ученый корректор Понаморова Н., стилистический редактор Меделка П.» [2].

І апошняя крыніца, на гэты раз друкаваная, – кніга «Інстытут беларускае культуры (ІНБЕЛКУЛЬТ): гісторыя ўзьнікненьня, сучасная структура, навукова-дасьледчая дзейнасьць» пад рэдакцыяй навуковага сакратара Інбелкульта А. І. Цьвікевіча, выдадзеная ў Мінску ў 1926 г. Дзяржаўным выдавецтвам Беларусі, на 103–105-й старонках якой размешчана глава «Выдавецтва». У самым яе пачатку гаворыцца: «…Прэзыдыум Інбелкульту прызнаў абавязковым, каб кіраванне выдавецкай справай было даручана яго адказнаму члену і каб самы аппарат выдавецтва з боку тэхнічнага быў забясьпечаны адпаведна кваліфікаванымі сіламі. У даны момант на чале Выдавецкага аддзелу, *аканчальна з'арганізаванага толькі ў лютым 1926 г.* (выдзелена мной. – Г.К.),

статiць Член Прэыдыуму Інбелкульту і Намесьнік яго Стар-шыні – А. Смоліч. Асобна вызначаная Рэдакцыйная Колегія складаецца з рэдактара-мовазнаўцы, рэдактара-грамадазнаўцы і двух рэдактараў па спецыяльнасьцях.

Тэхнічны бок выданьняў – стылістычная апрацоўка, навуковая і адказная карэктура ляжыць на М. Шчакаціхіне, П. Мядзёлцы і Н. Панамаровай.

У гэты самы час быў апрацаваны і зацьверджаны Навуковай Радай Інбелкульту яго выдавецкі план. Да таго ж часу адбывалася толькі набіраньне матар'ялаў і друкаваньне найбольш пільных выданьняў (анкеты, інструкцыі, часопіс «Наш край»).

Згодна прынятаму правілу, выдавецкі аддзел Інбелкульту ахапляе сабой толькі выданьні, якія падгатаваны ў асноўных Секцыях і Камісіях Інбелкульту…».

Далей у главе пра выдавецтва гаварылася, як затрымліваецца выдавецкая чыннасць Інбелкульту з-за празмернай загрузкі мінскіх друкарняў заказамі Беларускага дзяржаўнага выдавецтва, розных наркаматаў і іншых устаноў БССР, а таксама з-за таго, што друкарні ні арганізацыйна, ні тэхнічна не былі прыстасаваны да акадэмічнага характару выданняў Інбелкульта (адсутнасць адпаведных шрыфтоў, спецыяльных навуковых знакаў, нежаданне друкарняў як камерцыйных устаноў лічыцца з патрабаваннямі дакладнасці навуковага выдання).

«Каб дасягнуць пастаўленых навуковаму выдавецтву мэт, Інбелкульт увесь час клапаціўся аб набыцці ўласнай друкарні. Сёння гэта задача пры падтрыманьні Савета Народных Камісараў БССР зьдзейсьнена: з 1926–1927 акадэмічнага г. Інбелкульт ужо мае ўласную друкарню. Пасьля набыцця патрэбных шрыфтоў, і дапасаваньня яе з тэхнічнага боку да сваіх патрэб, Выдавецкі аддзел Інбелкульту будзе магчы ісьці ўзровень з тымі вымаганьнямі, якія маюць да яго паасобныя Сэкцыі і Камісіі».

Далей апавядалася, што ў сувязі «…з труднасьцямі акадэмічна-правільнага беларускага друку, вынікаючымі таксама з неаканчальнай усталенасьці беларускага правапісу, і ў зьвязку з недасканаласьцю паказанага вышэй тэхнічнага боку, нельга было за мінулы пэрыод выканаць поўнасьцю той плян, які быў вызначаны (да 200 друк. аркушаў). Аднак значная частка яго ўжо зроблена. Ужо надрукаваны і канчаюцца друкам наступныя выданьні з выдавецтва па пляну 1926 г.

- Працы Ўсебеларускай Глебазнаўчай Канферэнцыі.
- Музычная тэрміналёгія.
- Мэдычная .......“....... ч. 1.
- Лясная .....“......
- Праўна-канцэлярская тэрміналёгія.
- Полянская. Геоботанічны нарыс Мазырскай акругі.
- Зьбітоўскі. Геоботанічны нарыс Слуцкай акругі.
- Фядзюшын. Дзьве фауністычныя экспэдыцыі: у Віцебшчыну і на Птыч.
- Сяржпутоўскі. Этнографічныя матэрыялы (казкі паляшукоў).
- Працы першага зьезду археолёгаў і археографаў.
- Беларускі архіў. Зборнік старадаўніх актаў XVI і XVII ст.
- Юбілейны Скарынінскі Зборнік.
- Зборнік прац па НОП.
- Збонік прац Горацкага Навуковага Таварыства па вывучэньні Беларусі пры ІБК.
- Акадэмічнае выданьне твораў Максіма Багдановіча, т. 1.
- Матар'ялы па беларускай бібліографіі. 1 выпуск.
- Растаргуеў. Северска-беларускія дыялекты.
- Смоліч. Організацыя сялянскай гаспадаркі ў Цэнтральнай Беларусі.
- Працы І Краязнаўчага Зьезду.
- «Наш край». Штомесячная краязнаўчая часопісь.
- Анкеты і інструкцыі ў тым ліку вялікія:
  - *Інструкцыя для зьбіраньня зоолёгічных матар'ялаў.*
  - *Анкета па вывучэньні тэхнікі сялянскай гаспадаркі.*
  - *Сербаў. Вічынцы-паляне.*
  - *Зборнік прац Гістарычна-археолёгічнай Камісіі.*
  - *Бабарэка. Літаратурная творчасць Дубоўкі.*
  - *Блюдуха і Грамыка. Вынікі геолёгічнай экспэдыцыі ў Магілеўшчыну.*

Далейшыя выпускі бібліографічных матар'ялаў (археолёгія, вытворчыя сілы, сельская гаспадарка і г.д.), тэрміналёгіі (гістарычная, сельскагаспадарчая, мэдычная, хэмічная, глебазнаўчая), актавых матар'ялаў, акадэмічнага выданьня твораў пісьменнікаў і г.д.».

Мы наўмысна прывялі цалкам пералік выданняў 1926 г., паколькі гэта не можа не выклікаць цікавасці як у сучасных акадэмічных вучоных, так і ў нас, выдаўцоў.

Такім чынам, падсумоўваючы прыведзеную вышэй інфармацыю, можна з дастатковай доляй верагоднасці лічыць, што выдавецтва Інбелкульта канчаткова афармілася ў 1926 г. Безумоўна, выдавецкая дзейнасць вялася і да гэтага часу: існавала рэдакцыйная калегія, друкаваліся часопіс, іншыя матэрыялы. Відаць, на падставе гэтых акалічнасцей і палічылі магчымым нашы папярэднікі назваць

1924 г. годам стварэння выдавецтва, хоць яно і не было афіцыйна і канчаткова вылучана ў самастойную адзінку ў структуры Інбелкульта.

З 1929 г. выдавецтва – у складзе Беларускай акадэміі навук. З 1932 г. называлася выдавецтвам Акадэміі навук, з 1963 г. – «Навука і тэхніка» (да пачатку 1990-х у складзе выдавецтва была друкарня імя Ф. Скарыны). У 1996 г. выдавецтва «Навука і тэхніка» было скасавана і на яго базе ўтворана выдавецтва «Беларуская навука». 10 лютага 2005 г. у адпаведнасці з пастановай Бюро Прэзідыума НАН Беларусі ў выніку рэарганізацыі выдавецтва «Беларуская навука» шляхам далучэння да яго рэдакцыйна-выдавецкай установы «Навука і інавацыі» і паліграфічнага ўчастка ўтворана рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі дом «Беларуская навука».

## Кіраўнікі выдавецтва

Паводле архіўных дакументаў, якія прыводзіліся вышэй, на чале выдавецкай справы быў член Прэзідыума Інбелкульта А. Смоліч, сакратаром рэдакцыйнай калегіі – М. Красінскі. Пазней дырэктарамі выдавецтва былі Сініцкі (1935 г.), Гурэвіч (1936), У.С. Брэнейзен (1940–1941), І.А. Вексельман (1947), А.С. Мікульскі (1948–1964), Дз.І. Уксусаў (1964–1968), Ф.І. Савіцкі (1968–1996), Л.І. Пятрова (1996–2005). Галоўныя рэдактары: В.С. Асіноўскі (1949–1964), Ф.І. Савіцкі (1964–1968), Ю.І. Бярозкін (1968–1969), М.М. Акаловіч (1970–1987), В.У. Ляшчынскі (1987–1995), Л.І. Пятрова (1995–1996), Ф.І. Савіцкі (1996–2002), Я.А. Прэсман (2002–2005).

Кіраўніцтва Выдавецкага дома «Беларуская навука»: дырэктары А.І. Сташкевіч (2005–2018), А.М. Дудзік (з 2018); у 2005–2025 гг. намеснікам дырэктара працаваў С.А. Нічыпаровіч; галоўныя рэдактары – Г.К. Кісялёў (2005–2017), А.М. Дудзік (2017–2018), В.М. Пручкоўская (з мая 2025 г.).

У канцы 2018 г. галоўная рэдакцыя кніжных выданняў і навуковых часопісаў НАН Беларусі (асноўнае падраздзяленне выдавецтва) была ператворана ў рэдакцыю кніжных і перыядычных выданняў. Яе загадчыкі – Т.А. Гарбачэўская (2019 – люты 2024), В.М. Пручкоўская (сакавік 2024 – май 2025).

## Дзейнасць выдавецтва

Сучасная структура выдавецкага дома наступная: адміністрацыя (дырэктар і яго намеснік), бухгалтэрыя, рэдакцыя кніжных выданняў і навуковых часопісаў, рэдакцыі часопісаў «Наука и инновации», «Аграрная экономика», газеты «Навука», аддзелы: вытворчы (з сектарам тэхнічнай падрыхтоўкі рукапісаў), мастацкага афармлення, рэалізацыі і маркетынга, участак аператыўнай паліграфіі. Асноўны напрамак дзейнасці ўстановы – выпуск навуковай, навукова-папулярнай, даведачнай і іншай літаратуры, выданне навуковых часопісаў і газеты, заснавальнікам якіх з'яўляецца НАН Беларусі, аказанне паліграфічных паслуг. Сярод іх навуковыя часопісы «Доклады Национальной академии наук Беларуси» (перыядычнасць выхаду 6 разоў на год), «Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (штоквартальна ў 7 серыях: аграрных, біялагічных, гуманітарных, медыцынскіх, фізіка-матэматычных, фізіка-тэхнічных і хімічных навук), «Аграрная экономика» (выходзіць штомесячна), штомесячны навукова-практычны часопіс «Наука и инновации», штоквартальны навукова-тэарэтычны і інфармацыйна-метадычны часопіс «Вестник Фонда фундаментальных исследований», навуковы часопіс «Прыродныя рэсурсы» (выходзіць двойчы на год), навуковая інфармацыйна-аналітычная газета «Навука» (да 2015 г. – «Веды», выходзіць штотыднёва).

Як і на пачатку дзейнасці выдавецтва ў 20-я гг. XX ст., у першым дзесяцігоддзі XXI ст. выдавецкі дом спазнаў цяжкасці з паліграфічным выкананнем сваёй прадукцыі. Асаблівасць акадэмічных выданняў – іх малатыражнасць, а буйныя друкарні, якія маглі б на высокім паліграфічным узроўні забяспечыць іх выпуск, тэхнічна разлічаны на шматтыражныя партыі кніг. Друкаваць 300 экзэмпляраў кнігі па цане як за тысячу было дастаткова накладна. Выйсце палягала ў развіцці сваёй паліграфічнай базы, тым больш што на рынку з'явілася адпаведная тэхніка для малатыражнай паліграфіі. З дапамогай Прэзідыума НАН Беларусі і за кошт уласных сродкаў выдавецкі дом з цягам часу абсталяваў свой участак аператыўнай паліграфіі сучаснай лічбавай тэхнікай, што дазваляе друкаваць сваімі сіламі амаль усю перыёдыку, за выключэннем часопіса «Наука и инновации» і газеты, значную частку (больш за 80% гадавога выпуску па назвах і ўмоўных друкаваных аркушах) кніжнай прадукцыі, а таксама выконваць заказы розных арганізацый і ўстаноў на друкаванне брашур, часопісаў, буклетаў, лістовак і іншых відаў паліграфічнай прадукцыі.

Сёння « Беларуская навука» – не толькі адно са старэйшых выдавецтваў краіны, але і буйнейшы ў Беларусі ўніверсальны цэнтр па выданні навуковай перыёдыкі і літаратуры па розных галінах навукі. Сваёй шматграннай дзейнасцю выдавецтва робіць значны ўнёсак у папулярызацыю навукі і прапаганду дасягненняў акадэмічных вучоных і ўстаноў.


**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ**

1. Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі. Ф. 67. Воп.1. Спр. 9.
2. Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі. Ф. 67. Воп.1. Спр. 13.